**МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

пр. Пераможцаў, 11, 220004, г. Мінск
тэл. +375 17 203 75 74, факс +375 17 203 90 45
БІК: AKBB BY 2X; рахунак:
BY71AKBB36049000026690000000
ААТ «ААБ Беларусбанк»
e-mail: ministerstvo@kultura.by

**МИНИСТЕРСТВО КУЛЬТУРЫ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ**

пр. Победителей, 11, 220004, г. Минск
тел. +375 17 203 75 74, факс +375 17 203 90 45
БИК: AKBB BY 2X; счет:
BY71AKBB36049000026690000000
ОАО «АСБ Беларусбанк»
e-mail: ministerstvo@kultura.by

24.02.2022 № 04-09/395/н

На № 359 ад 22.02.2022

КУП “Мінскі гарадскі цэнтр нерухомасці”

Грибень С.Н. для разрешения работы

У адпаведнасці з заканадаўствам аб адміністрацыйных працэдурах накіроўваем дазвол на выкананне навукова-даследчых і праектных работ на матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцях.

Дадатак: дазвол Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь ад 22.02.2022 № 04-01-08/114 на 1 л. ў 1 экз.

Намеснік Міністра С.А.Саракач

04 Чарняўскі 200 11 36

**МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**
220004 г. Мінск, праспект Пераможцаў, 11, тэл. (017) 203 75 74, факс 203 90 45

# ДАЗВОЛ
## на выкананне навукова-даследчых і праектных работ на матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцях ад 22 лютага 2022 г. № 04-01-08/114

Дазвол сапраўдны да 31 снежня 2022 г.

У адпаведнасці з артыкулам 115 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб культуры дазвол выдадзены КУП “Мінскі гарадскі цэнтр нерухомасці”

| | |
|---|---|
| на правядзенне навукова-даследчых і праектных работ | па рамонце і рэканструкцыі (мадэрнізацыі) будынка па пр. Незалежнасці, 77 у складзе |
| матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці катэгорыі “2” | “Дом друку” (1935 г.) па пр. Незалежнасці, 77, 79 у г. Мінску. |

Асобыя ўмовы:

распрацоўку навукова-праектнай дакументацыі на выкананне рамонтна-рэстаўрацыйных работ ажыццяўляць пад кіраўніцтвам грамадзяніна (у тым ліку індывідуальнага прадпрымальніка), які мае пасведчанне на кіраўніцтва распрацоўкай навукова-праектнай дакументацыі (п. 1 артыкула 116 названага Кодэкса) – пералік атэставаных спецыялістаў размешчаны на сайце Міністэрства культуры ў раздзеле “Гісторыка-культурная спадчына”;

прымаемыя навукова і метадычна абгрунтаваныя праектныя рашэнні павінны прадугледжваць безумоўнае захаванне і (або) аднаўленне адметных вартасцей (дэкаратыўных, мастацкіх, архітэктурных і іншых каштоўных элементаў) гісторыка-культурнай каштоўнасці, што прадугледжана палажэннямі артыкулаў 103, 104 Кодэкса;

работы выконваць на падставе матэрыялаў навукова-даследчых работ (артыкул 112 Кодэкса), выкананых у аб’ёме, дастатковым для абгрунтавання праектных рашэнняў;

прадугледзець выкарыстанне будаўнічых і аддзелачных матэрыялаў, характэрных для гісторыка-культурнай каштоўнасці;

праектныя рашэнні, якія могуць прывесці да навукова неабгрунтаваных (не пацверджаных матэрыяламі навукова-даследчых работ) змяненняў архітэктурнага аблічча гісторыка-культурнай каштоўнасці, пагаршэння візуальных умоў яе ўспрымання, страты гісторыка-культурнай каштоўнасці і (або) яе адметных вартасцей супярэчаць заканадаўству аб культуры і не падлягаюць узгадненню;

прадставіць навукова-праектную дакументацыю на ўзгадненне ў Міністэрства культуры згодна з артыкулам 119 Кодэкса;

для атрымання дазволу на працяг работ прадставіць у Міністэрства культуры справаздачу аб выкананых работах за папярэдні год, падрыхтаваную асобай, на якую ўскладзены абавязак кіраўніцтва распрацоўкай навукова-праектнай дакументацыяй (п. 3.15 Адзінага пераліку, зацверджанага пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 17 лютага 2012 г. № 156).

Матэрыяльная гісторыка-культурная каштоўнасць катэгорыі “2” – “Дом друку” (1935 г.) па пр. Незалежнасці, 77, 79 у г. Мінску пад шыфрам 712Г000199 уключана ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь згодна з пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 14 мая 2007 г. № 578.

Намеснік Міністра С.А.Саракач

04. Чарняўскі 200 11 36